**Литература**

1. Bericht der Bundesregierung zur Auswärtigen Kulturpolitik 2007/2008 [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.ifa.de/fileadmin/content/informationsforum/auswaertiges_amt/akp_2007_2008.pdf. — Дата доступа: 20.11.2011.

2. Логинова, Н. А. Международная деятельность ФРГ в области развития культурного сотрудничества на примере работы организаций-посредников и политических фондов в 1990–2000 гг. / Н. А. Логинова, Г. А. Нелаева // Современные научные исследования и инновации [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://web.snauka.ru/issues/2011/09/2672. — Дата доступа: 25.11.2011.

# Прагрэсіўнае ў Статуце ВКЛ 1588 года

*Лазовік Я. Г., студ. I к. БДУ,*
*навук. кір. Ляскоў А. Я.,*
*канд. юр. навук, дац.*

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года з’яўляецца адным з найбольш выдатных помнікаў беларускага феадальнага права. Гэты Статут стаў трэцім, які быў створаны ў ВКЛ. Ён ўвабраў у сябе самыя прагрэсіўныя прававыя палажэнні, існуючыя ў той гістарычны перыяд.

Аднак галоўнай адметная рысай Статута стала тое, што ён заканадаўча пацвердзіў дзяржаўны суверэнітэт Вялікага Княства Літоўскага, нягледзячы на акт Люблінскай уніі. Як адзначае прафесар Я. А. Юхо, складальнікі не ўнеслі ў яго ніводнай нормы, якая магла б пашкодзіць дзяржаўнай самастойнасці краіны [1].

У адрозненне ад Статута 1566 года, у трэцім літоўскім Статуце знайшлі адлюстраванне не толькі нормы, якія адпавядалі тагачаснаму грамадскаму становішчу, але і тыя, што нават апярэджвалі час. Сведчаннем багатай нацыянальная традыцыі стала выкарыстанне пры складанні Статута беларускай мовы.

Прагрэсіўнасць Статута вызначаецца яшчэ і тым, што ў яго былі ўключаны нормы дзяржаўнага права, чаго не было ні ў адной краіне Еўропы.

Адметнасцю з’яўляецца тое, што ў Статуце 1588 года, як адзначае прафесар Я. А. Юхо, рабіліся спробы сістэматызацыі права на новых прынцыпах, якія былі ўласцівыя для пераходнай эпохі ад Сярэднявечча да Новага часу і зараджэння буржуазных адносін. У прыватнасці, былі зроблены першыя крокі да раздзялення ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую, як гэта прынята ў сучаснасці.

У адпаведнасці са Статутам 1588 года была абмежавана ўлада гаспадара. У звароце Льва Сапегі да саслоўяў, надрукаваным у прадмове да Статута, гаворыцца: «Сам господар пан наш жадное звирхности над нами заживати не можеть, одно толко, колко ему право допущаетъ». Заканадаўчая ўлада замацоўвалася за соймам,

выканаўчая — за вялікім князем і Радай, судовая — за вялікакняскім і галоўным судамі, а таксама мясцовымі судамі [2], [3].

Немалаважную ролю мае і заканадаўчае замацаванне агульнасці права для ўсёй дзяржавы і кожнага паўнапраўнага чалавека. Але пытанне адзінства права для ўсіх грамадзян падрывала наяўнасць ільгот і прывілеяў для пануючых саслоўяў.

Ідэя прававога парадку, якая праходзіць праз Статут, адлюстроўвае адыход ад дактрыны паходжання дзяржавы і права, уласцівай для сярэднявечнай Еўропы. Аб гэтым пісаў канцлер Леў Сапега: «Для того права суть постановлены, абы можному и потужному не все было вольно чынити. Яко Цыцеро поведил, иж естесмо невольниками прав для того, абысьмы вольности уживати могли» [4].

Відавочна, што Статут ВКЛ 1588 года грунтуецца на рэнесансных гуманістычных ідэях. Калі параўноўваць яго з папярэднімі Статутамі 1529 года і 1566 года, у якія былі ўключаны палажэнні аб асабістай недатыкальнасці і пакаранні толькі па рашэнні суда, то ў трэцім Статуце яны былі ўнесены як найбольш важныя прававыя свабоды грамадзяніна і былі размешчаныя ў пачатку раздела І (артыкул 2).

У сваім звароце да караля канцлер Леў Сапега ў якасці адной з галоўных мэтаў права называе пакаранне злых і ўзнагароду добрых: «И тотъ то естъ цель и конецъ всихъ правъ на свете, тымъ все панъства и королевъства стоять и в целости своей захованы бывають, где лихие помъсту, а добрые заплату относят, чого ижъ се завжды тые лекають, которымъ своя воля мила, а розумъ имъ неприетелемъ: ради бы тое удило зъ себе скинули, а права все, абы имъ не пановали, ради бы внивечъ обернули» [5]. На погляд Ю. Бардаха, «уплыў гуманістычных ідэй у III Статуце спалучаецца з тыповым для познефеадальнага перыяда узмацненнем крымінальных пакаранняў» [6].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года зрабіў велізарны ўклад у развіццё тагачаснага права не толькі ў ВКЛ, але і ў іншых краінах Еўропы. У ім захавалася найлепшае з таго, што было зроблена раней, а таксама ўнесены новыя нормы, адпавядаючыя патрэбам часу. Быў узяты накірунак на гуманістычныя ідэі, якія арганічна спалучаюцца з нормамі феадальнага права. На наш погляд, немагчыма не адзначыць прагрэсіўнасць дадзенай крыніцы права, якая дала пачатак многім прававым прынцыпам, якімі карыстаюцца ў Беларусі і да сённяшніх дзён.

## Літаратура


1. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я. А. Юхо. — Мінск: РІВШ БДУ, 2000. — 1 ч. — 352 с. — С. 214.
2. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я. А. Юхо. — Мінск: РІВШ БДУ, 2000. — 2 ч. — 352 с. — С. 216.
3. Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588 / Пер. на сучас. бел. мову А. С. Шагун. — Мінск: Беларусь, 2002. — 207 с. — С. 16.
4. Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588 / Пер. на сучас. бел. мову А. С. Шагун. — Мінск: Беларусь, 2002. — 207 с. — С. 47.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588 / [БДУ, Юрыдычны фак.; транскрыпцыя тэксту падрыхтавана С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар, Л. Л. Голубевай]. — Рэпрынтнае выд. — Мінск, 2010. — 618 с. — С. 248.
6. Бардах, Ю. История государства и права Польши: [пер. с польского] / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак: [предисл. З. М. Черниловского]. — М.: Юрид. лит., 1980. — 559 с. — С. 218.

## Установление границ Австрийской республики по Сен-Жерменскому мирному договору (1919 г.)

*Мацкевич М. Г., студ. III к. БГУ,*
*науч. рук. проф. Шадурский В. Г.,*
*д-р ист. наук*

Великие державы, выйдя победителями из Первой мировой войны, различными путями стремились усилиться за счет проигравшего противника. Объектом раздела стала и Австро-Венгерская империя.

В умонастроениях славян и других народов Австро-Венгрии все отчетливее стали проявляться разочарование в империи Габсбургов, неверие в ее способность гарантировать совместное существование и необходимую безопасность населяющим ее народам. Процесс распада империи начался еще за несколько недель до окончательного военного поражения центральных держав. Манифест Карла I провозгласил империю федеративным образованием, но было уже слишком поздно. Мировая война завершилась полным распадом исторической империи, просуществовавшей без малого четыре столетия [1].

Окончательно распад Австро-Венгерской империи, начавшийся в результате ее поражения в войне и подъема национально-освободительного движения населявших ее народов, был оформленподписанием мирного договора 10 сентября 1919 г. в Сен-Жерменском дворце, близ Парижа.

Часть южнославянских земель, прежде принадлежавших Австрии, отошла к Италии: Южный Тироль, Триест, Истрия, кроме города Фиуме (Риека), Гродиска, Зарица, Гориция с прилегающими к ним районами.Текст договора свидетельствовал о том, что «Австрия отказывается… в пользу Италии от всех прав на территории бывшей Австро-Венгерской монархии…» [2].

Бывшие австрийские владения — провинции Богемия, Моравия и Силезия вошли в состав Чехословакии. Королевство Сербов, Хорватов и Словенцев получило Боснию и Герцеговину, Далмацию, Крайну, Словению. Румыния получила Буковину, а Польша захватила Галичину. Сама Австрия получила от Венгрии Бургенланд, где большую часть населения составляли немцы.

Австрия должна была признать независимость государств, образовавшихся на ее бывших территориях. Вене запрещалось без согласия Лиги Наций предпри-